эстетические – желание развить физические качества, улучшить осанку, фигуру по данным наших исследований

Кроме того, предпочтения студентов и курсантов в выборе вида спорта не находят должного отражения в системе физического воспитания в ВУЗе или не соответствуют запросам молодежи. Для привлечения студентов на занятия стоит обратить внимание на их предпочтения в выборе форм занятий и их содержания.

Из сказанного выше следует, что мотивационная направленность и интересы в сфере физической культуры и спорта у курсантов и студентов различаются. Для них следует предусмотреть не только различные нормативы, но и различную направленность занятий, а т.к. выбор тематики не ограничен определенным избранным видом спорта из-за отсутствия строгой спортивной направленности специализации, то возможен также подбор видов по интересам, варьирование форм, средств и методов организации занятий.

Список использованных источников:

1. Родионов, А.В. Психология физического воспитания и спорта: учебник для ВУЗов / А.В. Родионов – М.: Академический Проект, 2004. – С. 16-36.
2. Мещеряков В.Г., Зинченко В.П. Большой психологический словарь. Прайм-Еврознак, 2007г.
3. Маслоу, А. Самоактуализация // Психология личности. Тексты / под ред. Ю.Б. Гиппенрейтер, А.А. Пузыря. – М., 1982. – С. 108-118.
4. Немов, Р.С. Психология: учебник для высших педагогических учебных заведений. В 3 кн. Кн. 1. / Р.С. Немов… – М.: ВЛАДОС, 1997. – 651 с.

**УДК 37.013.8: 39 : 37.036(043.3)**

# ВЫКАРЫСТАННЕ ІНТЭНСІФІКАТАРАЎ МАРАЛЬНА-ЭСТЭТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ

**С.Р. Туболец**
*Віцебск, УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”*
(e-mail: svetla237@rambler.ru)

Народ становіцца народам дзякуючы сваім поглядам, вераванням. Беларуская міфалогія захавала не толькі вобразы першапачатковых боскіх і дэманічных істот, але і правілы ўзаемадзеяння з імі, варыянты чалавечых паводзін, каб дабіцца спагады, абароны ад звышнатуральнай сілы. Г.Н. Волкаў піша, што будынак чалавечай асобы ўяўляецца як бы пабудаваным на чатырох “гранітных слупах” – самым трывалым з падмуркаў: навука (веды), рэлігія (вера), мастацтва (прыгажосць), выхаванне (любоў). Адзначым, што беларуская народная педагогіка адводзіла кожнаму з іх пэўнае месца. З дапамогай традыцыйнага ўкладу, падыходаў да выхавання і жыцця ў асобе ўзмацняўся духоўны падмурак. Веды аб вядзенні гаспадаркі, чалавечых зносінах, Сусвеце; уяўленні пра рэальны і нябачны свет, яго пабудову; адносіны да бацькоў, дзетак – усё прасякнута прыгажосцю.

Беларус марыць аб асэнсаванай працы, якая нясе дабрабыт у сям’ю, аб здароўі, мірным жыцці. Адлюстраваны мары чалавека ў песнях, казках, паданнях, замовах – ва ўсіх жанрах вуснай народнай творчасці. Калектыўныя ўяўленні аб ідэальным жыцці пераўтвараюцца ў пэўныя абрадавыя дзеянні. Згодна з Э. Дзюркгеймам, гэтыя дзеянні падразумяваюць уздзеянне і рэагаванне з боку іншага і самі выступаюць вынікам такіх узаемадзеянняў.

Аднолькавыя словы, жэсты, якія адносяцца да адной рэчы, пераўтвараюць людзей у еднасць, у цэлае. Роля калектыўных дзеянняў заключаецца ў тым, што група асэнсоўвае, усведамляе сябе, сваю існасць. Калектыўныя дзеянні становяцца сімваламі – умоўнымі знакамі сэнсавага выражэння грамадскай свядомасці. Такая сімволіка перадаецца з пакалення ў пакаленне, незалежна ад асобных прадстаўнікоў супольнасці, суправаджае ўсе значныя падзеі грамадства. Свая сімволіка існуе і для духоўна-маральнага жыцця чалавека. У гэтай сувязі асабліва важныя народныя абрады. Між імі асаблівае месца належыць рытуалам пераходу – нараджэння, вясельны і пахавальны. Кожны з іх сімвалізуе асаблівыя формы ўзаемадзеяння і адносін паміж людзьмі, дапамагае зняць псіха-эмацыйнае напружанне, дазваляе звярнуць увагу на эстэтычны аспект рэчаіснасці. У абрадавых дзеяннях прасочваецца сацыяльная матывацыя: прыняцце і захаванне індывідам яго статусу



Репозиторий ВГУ

і асэнсаванне перамен, што непазбежныя з часам. Практыка абрадавых дзеянняў накіравана на рэгламентацыю працэсаў засваення культурных роляў і норм паводзін на розных этапах жыцця. Чалавечыя ўчынкі, перажыванні, ідэалы з’яўляюцца каналамі сувязі мінулага і сучаснага – гістарычнай і паўсядзённай памяццю. Гэта сцвярджаў Э. Касірэр: “Мы не можам апісаць чалавечы ўспамін як просты зварот да падзеі, як слабы вобраз ці копію папярэдніх уражанняў. Гэта разам не проста паўтор, а хутчэй адраджэнне мінулага – яно ўключае творчы і канструктыўны працэсы” [2, с. 500].

Прыгажосць як месца сутыкнення двух сусветаў ёсць увядзенне быцця ў маральны аспект праз яго адухаўленне, працяг пачатай прыродай мастацкай справы ў святле будучай рэчаіснасці, інакш кажучы, пачуццёвае адлюстраванне ў матэрыяльным свеце ісціны і дабра [3, с.959]. З дапамогай мастацтва чалавек рабіў спробу паўплываць на долю: асабістую ці значных для яго людзей (што вяло да эстэтычнага асэнсавання рэчаіснасці). Гэтыя абрады прасочваюцца ва ўсім гадавым абрадавым цыкле. Аб гэтым сведчыць І.С. Сычова: “Толькі кананічна правільнае і па-мастацку дасканалае выкананне абраду магло забяспечыць дабрабыт, што садзейнічала практычна-дзейнаснаму характару эстэтычнага выхавання, павышала значнасць навыкаў у галіне народнага мастацтва” [4, с.69].

Шэраг вераванняў, характэрных для беларускай народнай традыцыі, ірацыянальна дэтэрмінуе, пашырае, падвойвае свет, бо вядзе да пошуку больш спрыяльнага на падставе кананічна добрага і прыгожага, пабудавана на эстэтычным перажыванні маральных учынкаў. Напрыклад, нельга было адмовіць цяжарнай жанчыне ў яе просьбе, бо інакш той, хто адмовіў, панясе матэрыяльныя страты – мышы (моль) пагрызуць што-небудзь [1]. Існавалі патрабаванні і да цяжарнай жанчыны, напрыклад, не глядзець на агідныя рэчы, каб не прынесці шкоды дзіцяці. Калі выбіралі немаўлятку імя, мусілі засцерагчыся называць яго імем чалавека з няўдалым лёсам, маральна непрыгожага, нешчаслівага; перавага аддавалася імёнам паважаных людзей, працавітых, сямейных.

У беларусаў лічылася не толькі непрыгожым, але і надзвычай небяспечным класці на стале хлеб скарынкаю ўніз, бо гэта дэманструе нешаноўныя адносіны да хлеба і лічыцца нават пажаданнем смерці бацькам. Жыццё і смерць падзяляюць прастору на “гэты” і “той” свет, кожны з якіх мае свае правілы існавання. Спецыфічнае патрабаванне да блізкіх паміраючага падчас агоніі аддаліцца ад пасцелі, спыніць размовы, плач, рух, каб не збіць з апошняга шляху і не падоўжыць ягоных пакутаў, цяжэйшых за ўсе перажыванні [1, с.473]. Свае асаблівасці паводзін назіраліся і падчас нараджэння дзіцяці – ад выбару “вылучаных месцаў” да рытуалаў “пераводу” немаўляці ў гэты свет.

Падваенне свету патрабуе наяўнасці спосабу ўплыву на яго абедзве часткі. Беларусы іх аб’ядноўваюць праз успаміны, уводзяць у кола сучаснасці тых, хто ўжо сышоў у нябыт. Гэтая галіна духоўнага жыцця прасочваецца ў рытуальных дзеяннях, у абрадах памінання продкаў на так званыя Дзяды, якія адзначаюцца некалькі разоў на год (масленічныя, радаўніцкія, траецкія, пятроўскія, змітраўскія).

Успаміны як асэнсаваны расповед пра мінулае, пра традыцыі сям’і, роду, станоўчыя прыклады жыцця найбліжэйшай суполкі напаўнялі і штодзённае жыццё. Яны фарміравалі сістэму народных прыкмет аграрнага календара, замацавалі традыцыі пашаны старэйшых. Усё гэта служыла асновай інтэнсіфікацыі маральна-эстэтычнага ўспрыняцця свету (“У Сямёнаў дзень да абеду ары, а пасля абеду аратага з поля гані”, “Сымон да варот, на дварэ сем пагод: сее, вее, круціць, муціць, зверху лье, знізу мяце”, існавала прыкмета “Калі на Апанаса бывае мяцеліца – чакаецца працяглая вясна і прыйдзецца нават “пунькі падмясці”), замацоўвала традыцыі пашаны старэйшых (“Бацькоў любі, старых паважай”, “Нічые такія слёзы, як матчыны: яны і ўтоляць, яны і шчасця выпрасяць”). Усё гэта служыла асновай інтэнсіфікацыі маральна-эстэтычнага ўспрыняцця свету.

Духоўны падмурак чалавека – тая аснова, што будуецца з дапамогай традыцыйнага ўкладу, звыклых, спецыфічна народных падыходаў да жыцця і выхавання, якое надае моц асобе. Эмацыянальнасць штодзённага жыцця, здольнасць да эстэтызацыі дзейнасці, падпарадкаванасць маральных учынкаў дапамагаюць эстэтычнаму ўспрыняццю жыцця. Магічна-мастацка-эстэтычныя дзеянні чалавека псіхалагічна ўплывалі на долю, супакойвалі ў прадчуванні і планаванні будучыні (варожбы на шлюб, ураджай, жыццё). Такія вераванні ірацыянальна пашыралі свет, бо вялі да пошуку дабра і прыгажосці. Успаміны знітоўвалі прастору жывых і памерлых: праз іх продкі становяцца духоўнымі абаронцамі, яднаючай катэгорыяй.



Рэпазіторый ВДУ

Усведамленне ролі трыяды (мары, народныя вераванні, успаміны) як інтэнсіфікатараў маральна-эстэтычнага жыцця дапаможа духоўнаму развіццю сучасніка праз напоўненасць штодзённага жыцця эмацыянальнасцю, эстэтычнасцю і маральнасцю учынкаў, што спрыяе добраму самаадчуванню і наадварот.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Беларуская міфалогія: энцыклапедычны слоўнік / С.Санько [і інш]; склад. І.Клімковіч. – Мінск: Беларусь, 2006. – 599 с.
2. Кассирер, Э. Человеческий мир пространства и времени: избранное: опыт о человеке / Э. Кассирер. – М.: Гардарика, 1998. – 500 с.
3. Новейший философский словарь / под ред. А.А.Грицанова. – Мн.: Книжный дом,2003. – 1280 с.
4. Сычова, І.І. Прынцыпы эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы / І.І. Сычова // Адукацыя і выхаванне. – 2006. – №10. – С. 65-74.

УДК 331.548

# СОДЕЙСТВИЕ ПОДРОСТКАМ В РЕАЛИЗАЦИИ ИХ ПРОФЕССИОНАЛЬНЫХ НАМЕРЕНИЙ

**А.А. Тыкоцкая**
*Могилев, УО «МГУ им. А.А. Кулешова»*
(e-mail: alla8998t@mail.ru)

Актуальность проблемы успешной реализации профессиональных намерений состоит в том, что при осуществлении выбора профессии подростками специалисты зачастую недостаточно учитывают весь комплекс социально-психологических феноменов, который определяет успешность профориентационной работы, формирование устойчивых профессиональных намерений каждой отдельной личности. Ошибка подростка при выборе профессии нежелательна, поскольку её последствия будут сказываться всю его жизнь. Неудачи в выборе профессии травмируют психику подростков, и они, впоследствии, наносят обществу ущерб низкой производительностью труда и текучестью рабочих кадров. Выбор подростком профессии только по принципу её престижности, перспективности и без учёта собственных способностей, наклонностей, возможностей ставит его в ситуацию риска оказаться в дальнейшем профессионально неуспешным, невостребованным вследствие перенасыщения рынка труда специалистами, которые в своей профессии не сумели достичь высокого уровня профессиональной успешности, что в свою очередь провоцирует массу новых психологических и социальных проблем. В случае правильного выбора молодым человеком профессии в выигрыше не только общество, получившее субъекта деятельности, но и сама личность, получающая широкие возможности для самоактуализации.

Н.Ф. Гейжан[1,с.5] говорит о том, что планирование профессионального будущего для многих выпускников школ является трудной задачей, они нуждаются в квалифицированной помощи взрослых при формировании личных профессиональных планов и при выборе профессии. Наиболее эффективной стратегией поведения взрослого, на наш взгляд, является социальное психолого-педагогическое содействие подросткам в реализации их профессиональных намерений. Содействие предполагает взаимопомощь, кооперацию, сотрудничество в целях развития действий учащихся по пониманию степени соответствия собственных особенностей требованиям выбираемой профессии и деятельность по саморазвитию у себя способностей и возможностей с целью достижения более полного соответствия своей личности относительно выбранной профессии и профессии – относительно собственных устремлений. Данный процесс предполагает совместный труд, каждый из участников которого является его активным агентом. При этом несколько субъектов сотрудничают для достижения конкретной цели. Содействие подросткам в реализации их профессиональных намерений предполагает помощь в активизации их самостоятельной деятельности по самоанализу, самопознанию и самооцениванию собственных способностей и ценностных ориентаций.

Мы понимаем под термином «содействие» помощь подросткам в реализации их профессиональных намерений или деятельное участие в их делах с целью облегчить, помочь, поддержать в деятельности, связанной с выбором профессии. Для формирующего содействия

Репозиторий ВГУ